# Сталічны гандаль. Ацэнка—«нездавальняюча»

**Першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР М. Мясніковіч пабываў на радзе прадпрыемстваў гандлю Мінска і пазнаёміўся са станам гандлёвага абслугоўвання жыхароў беларускай сталіцы.**

Канешне ж, гэта наведванне было невыпадковым. Урад рэспублікі сур'ёзна заклапочаны тым, што ў горадзе за апошні час прыкметна пагоршылася арганізацыя гандлю, знізілася дысцыпліна і адказнасць кадраў, якія працуюць у гэтай жыццёва важнай сферы. Сёння, ва ўмовах хранічнага дэфіцыту, вельмі напружанай абстаноўкі на спажывецкім рынку, прадпрыемствы гандлю, здавалася б, павінны рабіць усё для таго, каб наладзіць дакладную і бесперабойную рэалізацыю хоць бы тых таварных рэсурсаў, якія яны маюць. Аднак многія працуюць так, што да нармальнага сервісу вельмі далёка.

Гэта, дарэчы, паказала наведванне універсамаў «Рыга», «Вільнюс», «Сталічны», некаторых іншых гандлёвых кропак. Чэргі і натоўпы ля кас, непрыглядны, мякка кажучы, выгляд мясных вырабаў, асабліва палавічыны, парушэнні правілаў водпуску тавараў, нежаданне гандлёвых работнікаў абцяжарваць сябе расфасоўкай прадукцыі — вось далёка не поўны «букет» тых недахопаў, з якімі сустракаюцца штодня людзі ў нашых магазінах.

Ну, а як ацэньваюць сітуацыю самі кіраўнікі ўказаных прадпрыемстваў гандлю? Атрымаць адказ на гэта пытанне аказалася практычна немагчыма, таму што большасць дырэктараў магазінаў у водпусках, а замяняючыя іх асобы пусцілі справу на самацёк, глыбока не ўнікаюць у гэтыя, відаць, другарадныя для іх праблемы.

Падводзячы вынікі свайго наведвання, М. Мясніковіч адзначыў, што арганізацыю гандлёвага абслугоўвання мінчан нельга прызнаць здавальняючай. Не адчуваецца паўсядзённай, канкрэтнай увагі да вырашэння гэтых праблем з боку кіраўніцтва горада і мясцовых Саветаў. Міністэрству гандлю БССР, выканкомам Мінскага гарадскога і раённых Саветаў народных дэпутатаў даручана ў кароткія тэрміны навесці парадак у арганізацыі работы сталічных прадпрыемстваў гандлю, асабліва ў пытаннях рэалізацыі мяса-малочнай прадукцыі, і на працягу жніўня далажыць ураду рэспубліцы аб прынятых мерах.

Савет Міністраў БССР, падкрэсліў М. Мясніковіч, будзе клапаціцца аб тым, каб аслабіць вастрыню абстаноўкі на спажывецкім рынку, палепшыць арганізацыю гандлёвага абслугоўвання людзей.

Трэба адзначыць, што цяпер гэтыя задачы з-за крызісу эканомікі, парушэння традыцыйных сувязей паміж рознымі рэгіёнамі краіны, нізкай дагаворнай дысцыпліны, ведамаснага эгаізму, разгулу спекуляцыі вырашаюцца вельмі няпроста. І тым не менш ураду, напрыклад, удалося стабілізаваць становішча з продажам насельніцтву цукру, хоць для гэтага прыйшлося пайсці нават на экстраны пошук дадатковых валютных сродкаў, заключэнне бартэрных здзелак, рэзкае пашырэнне знешнеэканамічных кантактаў рэспублікі. Апрача таго, улічваючы просьбы і пажаданні людзей, знойдзена магчымасць павелічэння ў Мінску норм водпуску гарэлкі ў жніўні. Прадпрымаюцца і іншыя крокі па «развязванню» найбольш моцных вузлоў на спажывецкім рынку, знаходжанню новых крыніц і рэзерваў павелічэння вытворчасці і рэалізацыі насельніцтву тавараў народнага спажывання.

**У. СКУРАТОВІЧ.**
**Служба інфармацыі Савета Міністраў БССР.**

Ад рэдакцыі. Думаецца, што першы намеснік прэм'ера зрабіў не надта вялікае адкрыццё: наш гандлёвы сервіс і пустыя паліцы даўно нікога не здзіўляюць, мы ўжо прывыклі да сакраментальнага: «Што даюць, тое і бяры...» Або да таго, што соўгаючы па нашых нагах бруднай анучай, пагардліва кідаюць: «Ходзяць тут усякія...». І, тым не менш, рэйд першага намесніка — гэта, вядома ж, вельмі добра. Нам шчыра хацелася б, каб нашы высокія асобы рэгулярна, разам з намі, наведвалі нашы, савецкія універсамы і гастраномы ды і ГУМы з ЦУМамі, і каб гэта не было нейкай звышардынарнай падзеяй. Бясспрэчна: словы «Ходзяць тут усякія» мы чулі б намнога радзей, а калі б і чулі, то, атрымаўшы іх, скажам, разам з міністрам гандлю, мы мелі б свайго роду маральную кампенсацыю.

Такім чынам, падобныя рэйды стануць звычайнай практыкай? Хто наступны?